**Алесь Мемус**

# Вецер і сьпераду, і ззаду

Рэпутацыя літаратурнага баламута дазваляе Адаму Глёбусу ўжо ня першае дзесяцігодзьдзе трымаць на сабе ўвагу літаратурнай публікі. Больш за тое, яго аўтарская манера ў каламуці (выбачайце, слова вельмі ж прыгожае) сучаснага беларускага пісьменства з гадамі, здаецца, набыла пранізьлівую вастрыню, што часам коле вочы і вярэдзіць слых як яго прыхільнікаў, так і яго нібы нядобразычліўцаў. Спадзяюся, шаноўны чытач заўважыў гэтае "нібы", бо і адвярнуўся бы ад Глёбуса — не, як магнэсам цягне ня толькі зірнуць, але і пацешыць вока яго прысутнасьцю. Вось жа і Павал Абрамовіч ня вытрымаў і зноў прыцягнуў увагу да Адама Глёбуса.

Дэпрэсія сп. Абрамовіча (гл. "ARCHE" — "Праўда Адамчыкаў", №4, 2003 г.), "люцейшая за тую, што пакінула сьмерць Быкава", на мой погляд, альбо перабор у сродках выразнасьці, альбо недабор у разуменьні іх. Чытаючы натурныя замалёўкі (як Вячаслава Адамчыка, так і сына яго Ўладзімера), я ніколі не адчуваю ня толькі дэпрэсіі, але цешуся вастрынёю выяўленчага дару абодвух. Згадзіцеся, вострая цікаўнасьць да блізкага (хай нават прасторава) ужо ніяк ня знак абыякавасьці да яго. Што ж так прыцягвае мастака да сябе падобнага? Бясспрэчна, гэта рысы выразнасьці аб'екта творчага дасьледаваньня, яго неардынарнасьць, але вырашальным тут бывае нябачнае вокам скрыжаваньне энэргетычных палёў. Калі побач вісяць скуры пантэры і гіены, і ад залішняе блізкасьці поўсьць вылазіць з аднае і другое...

Публічнае існаваньне гэткага жанру як бы "завочнай" рэфлексіі творцы аб творцу — наш добры набытак, які разьвейвае "затухлую" атмасфэру ў грамадзтве. Памятаю студэнцкі тэатар сатыры пры Віцебскім унівэрсытэце, які карыстаўся незвычайнай папулярнасьцю як у саміх студэнтаў, так і выкладчыкаў. У апошніх інтарэс быў асабліва абвостраны, бо каронным нумарам тых вечарынаў была менавіта сцэнічная сатыра на іх саміх. Заля калыхалася ад захапленьня, а некаторыя прататыпы "пэрсанажаў" тых відовішчаў часам хапаліся за валідол. Мяне ўразіла рэпліка жонкі аднаго калегі, які зноў (як і раней) застаўся па-за ўвагаю студэнцкіх кепікаў. Расчараваная, яна неяк безнадзейна прамовіла ў бок мужа: "Шэрая ты асоба, мілы мой, калі студэнты не заўважаюць твайго існаваньня..." На твары ейнага мужа праступілі сьляды дэпрэсіі (гл. дэпрэсію паводле Абрамовіча).

Дык, шаноўныя нядобразычліўцы Адама Глёбуса, ці забойца ён, ці даравальнік жыцьця?Вось паспрабуйце пераказаць словамі ўжо славутыя шаржы сп. Кукса, скажам, на Бугаёва, Вайняровіча, тых жа Гніламёдава і Зуёнка (у Кукса ён не нагадвае, як у Вяч. Адамчыка, нават Валошына), Мысьліўца, Шаўні, Шамякіна... Вы атрымаеце нешта больш "абразьлівае", чым пэрсанальныя партрэты з "Сучасьнікаў" ці замалёўкі з натуры аўтара "Дзёньніка 1998". Відаць, справа ў тым, што маляваны шарж даўно ў нас жанр клясычны, а вось шарж літаратурны, так бы мовіць, яшчэ немаўля. Немаўля, але кусаецца — во зараза!..

Мастакоўскі дар Адама Глёбуса, відаць, і справакаваў яго "Сучасьнікаў" (цыкл друкаваўся раней пад вельмі трапнымі назвамі "Нашы тутэйшыя", "Цёткі"). Што ж

тычыцца “візуальнае” адоранасьці яго бацькі, раю яшчэ раз перачытаць той самы “Дзёньнік 1998”, каб пераканацца ў каляровым багацьці сьвету ў Вячаслава Адамчыка. Гэты дар “злыдня” Адамчыка — ці ня знак яго любові да зямнога, якую крытык Абрамовіч так недарэчна паспрабаваў звузіць да абсурду.

У шаржы-сатыры, як маляваным, так і слоўным, мяжа паміж прыязным і варожым бывае вельмі хісткаю (як цярпімасьць кожнага з нас да крытыкі). Успрыманьне гледачом-чытачом мае тут сваю спэцыфіку, калі ацэньваецца не мадэль (аб’ект), што прыцягнула ўвагу мастака, але выяўленчае майстэрства творцы. Хваравітае ўспрыманьне шаржу яго правобразам ці блізкім яму чалавекам — знак недаразьвітасьці бачаньня твору, яго выяўленчых сродкаў. Вось тут і прарастае эфэкт “абразы”, бо абражаны перакідвае ўвагу з твору на сябе. Яму няўцям, што ён быў толькі носьбітам вобразных рысаў, што натхнілі сатырычны дар мастака. Але ў слоўным шаржы (сатыры) прысутнічае яшчэ і гучаньне выяўленчае палітры (і ёсьць словы, страшнейшыя за пісталет...). Творца захапляецца гэтай забойчай сілаю слова і, бывае, пераходзіць мяжу “дазволенага”. І бяскрыўдна сьмешнае для аднаго бывае амаль сьмяротным для іншага! Вось жа Абрамовіч цытуе: “дрыготкія рукі Зуёнка”, “тонкія губы Бураўкіна”, “сьнежнага чалавека, шыракаплечага і грузнага Гніламёдава”, “каратышку Іпатаву”... Але паспрабуйма выправіць “абразу” і ўявім гарэзьліва-таўстагубага Бураўкіна, цыбатую бамбізу Іпатаву, вузкагрудага слабака Гніламёдава, Някляева, што кідаецца наўцёкі ад прывабнае кабеткі... Што, палягчала? Тонкае ёсьць тонкім, шырокае шырокім, а прывабнае — нясьцерпна прывабным.

Цяжка намаляваць нас горшымі, чым ёсьць мы на самай справе. Ну а тым, хто зробіць нас (хай на хвіліну) цікавымі для іншых, раю быць удзячнымі, а то выходзіць зусім ужо сьмешна: такі я добры, а яны... Беларуская традыцыя шанаваньня “знакамітасьцяў” як “жыхароў неба” абяскровіла нашу літаратуру. Ці не таму “Сучасьнікі” Адама Глёбуса чытаюцца з такім азартам, бо робяць з “муміі” нешта яшчэ абнадзейліва жывое.Шмат што і шмат каго Вячаслаў Адамчык выкрасьліў ці абмінуў увагаю як нявартае ўвагі. Тых жа, хто застаўся ў яго “Дзёньніку” (пакрыўджаных асабліва), трэба павіншаваць, бо вартыя ўвагі і застануцца жыць. Як ні дзіўна, супрацьлеглыя высновы ў адрас аднае асобы збольшага бываюць праўдаю. І адны, і другія. Хто, скажыце, ня чуў у свой адрас: сволач, падонак, хам..., а разам з тым: любачка, мілы, найлепшы!.. І вось жа! Аб’ект гэткіх парадаксальных вызначэньняў падсьвядома прымае і адно, і другое, бо па прыродзе ён і такі, і гэткі. Выбар Вячаславам Адамчыкам пэрсаналіяў дзёньнікавых рэфлексіяў вызначалі драматызм жыцьцёвага кантэксту і атмасфэра апазыцыйнасьці грамадзкаму ладу жыцьця. Аблога, у якую патрапіў ён і яго блізкія (гл. запісы дзёньніка), пагаршэньне стану здароўя, разбурэньне вынашаных жыцьцём і творствам ідэалаў абвастрылі яго ўспрыманьне тых, хто напаўняў ягоную жыцьцёвую прастору. Падзел на сваіх-чужых у гэтым выпадку непазьбежны.

Сёньня, калі паміж Вячаславам Адамчыкам і многімі яшчэ жывымі яго сучасьнікамі пралёг пэўны пласт часу і боль пісьменьніка (схаваны адыходам) не вярэдзіць суайчыньнікаў, яго дзёньнікавыя запісы многіх прывялі ў стан шоку. Сьведкі і ахвяры іх непасьлядоўнасьці (назавем гэта так) ужо няма, а дух антаганізму абнародаваны. Як тут ня ўзьняць “высакароднага” лямáнту, як не абурыцца, бо я ня я. Маралісты адразу засьпявалі пра чыстыя ідэалы дабра і справядлівасьці, забываючыся на тое, што чужая бяда белымі ручкамі не разводзіцца.

Але маraліст абураецца і пад уплывам свайго “высакароднага абурэньня” робіць высновы: “Сэрца пісьменьніка перапаўняла зло і нянавісьць...”, “Пагарда і зьнявага да суайчыньнікаў, любоў да сям’і...”.

У тым жа дзёньніку адносна размовы з К. Крапівою чытаем: “Было, вядома, і маё прабачэньне і за трывогу, і за тэлефонны званок, за сваю, мусіць, неабдуманую прапанову і некарэктнасьць (Адамчык прасіў Крапіву ў дні яго 90-гадовага юбілею напісаць зварот да моладзі, ад чаго той катэгарычна адмовіўся. – **Аўт.**). Даруйце яшчэ раз, нарэшце я змогся ў сваёй мальбе і просьбе. ...З гадамі, успамінаючы гэты выпадак, я чую нейкую невымоўна цяжкую, незразумелую і невытлумачальную віну перад Кандратам Крапівою...”

Вось прыклад найдалікатнейшых адносінаў Вячаслава Адамчыка да сучасьніка і субрата па літаратуры, на якія была здольная яго душа. У тым жа дзёньніку далей: “Учора, сустрэўшы Сашу Станюту ў аптэцы, я падмовіў яго купіць маці, вядома за маё, бутэльку до пурпара (мал. віно). Спадарыня Стэфанія, напэўна, была бясконца рада. Бо хто ж успомніць пра шаноўных людзей, калі ня я”. Такая вось “пагарда і зьнявага да суайчыньнікаў”... Але кожны чытае і бачыць толькі тое, што запраграмаваў убачыць.

Разумны чалавек павінен быць больш плястычным ува ўспрыманьні і сьвету, і чалавека, і чалавечага творства. Выснова, характарыстыка, рэфлексія, што выказвае чалавек да чалавека, творца да творцы, заўсёды мае свой кантэкст адносінаў, а зразумець менавіта кантэкст дадзена ня кожнаму. Любоў і нянавісьць — катэгорыі паўнаты жыцьця, у якіх свая мараль і свае ідэалы.

Усё жывое імпульсіўна выказвае сябе. Вось іду па вуліцы, несучы пад носам белыя вусы, а з боку сустрэчных чую: то “Якое страхоцьце!”, то — “А мне даспадобы” (дзьве дзяўчыны, усьміхаючыся, абмяркоўваюць мае вусы). Можна, канечне, выдаць апошнім па ганарару, а да першага кінуцца з палкаю... Нашто тады розум, скажыце? Гэтак жа дваіста будзе, вядома, прынята і маё пісаньне. Адзін скажа: “Стары мудры яўрэй”, другі ўпэўнена: “Сам, мусіць, навалач страшэнная...” Так і жывем, бо вецер і сьпераду, і ззаду (а значыць, дыхаць яшчэ ёсьць чым). Калі нехта загігікае ад словазлучэньня “вецер ззаду”, значыць, жывы...

*Віцебск*